# Чарнобыльская тэма ў сучаснай прозе



*«О Беларусь, мая шыпшына…*
*У ветры дзікім не загінеш,*
*Чарнобылем не зарасцеш».*
*(Уладзімір Дубоўка).*

- У ноч на 26 красавіка 1986 года здарылася буйная тэхнагенная катастрофа: выбухнуў чацвёрты блок Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі. Аб «самай вялікай трагедыі Чарнобыля — трагедыі Беларусі» пісьменнік Алесь Адамовіч адзін з першых з трывогай сказаў у творы «Апакаліпсіс па графіку».
- «Радыяцыя — нябачны акупант», — ёміста, трапна заўважыў Анатоль Грачанікаў пра злавесную бяду.



# Чарнобыльская трагедыя

- Выбух на Чарнобыльскай АЭС здарыўся ўначы 26 красавіка 1986 года. На месца здарэння была выклікана каманда пажарнікаў. Смелыя і адважныя людзі, яны былі шакіраваны ўбачаным і па прыборах, якія зашкальвалі, адразу здагадаліся пра тое, што адбылося. Урэшце, думаць не было калі - і каманда з 30 чалавек кінулася на барацьбу з бедствам. З ахоўнага адзення на іх былі звычайныя каскі і боты. Вядома, яны ніякім чынам не маглі зберагчы пажарных ад велізарных доз радыяцыі. Гэтых людзей ужо даўно няма ў жывых, усе яны ў розны час памерлі.







- Раніцай полымя патушылі. Савецкія людзі не адразу даведаліся пра катастрофу, якая адбылася на Чарнобыльскай АЭС. Гэта дазволіла захаваць спакой і прадухіліць паніку. Нічога не ведаючае насельніцтва яшчэ цэлых два дні пасля выбуху спакойна адпачывала на тэрыторыі, якая стала смяротна небяспечнай. А 28 красавіка была абвешчаная поўная эвакуацыя. 1100 аўтобусаў калонай вывозілі насельніцтва Чарнобыля, Прыпяці і іншых бліжэйшых населеных пунктаў. Людзі кінулі свае дамы і ўсё, што ў іх знаходзілася - з сабой ім дазволілі ўзяць толькі пашпарт і ежу на пару дзён. Зона радыусам у 30 км была прызнана зонай адчужэння, непрыгоднай для жыцця чалавека. Вада, жывёла і раслінасць на гэтай тэрыторыі былі прызнаны непрыгоднымі да ўжывання і якія нясуць небяспеку для здароўя.







- Чарнобыльская катастрофа спарадзіла разбурэнне традыцыйнага ўкладу жыцця, хаос, абсурд, яна перасягнула межы чалавечай свядомасці, разумовага і ўнутранага досведу. І як рэакцыя — зварот пісьменнікаў да ўмоўна-мастацкага ўвасаблення рэчаіснасці. Паводле падлікаў, на чарнобыльскую тэму з’явілася больш за 500 вершаў, каля двух дзесяткаў паэм: сярод іх такія значныя творы як «Чорная быль» і «Зязюля», якія ўвайшлі ў кнігу «Чорны конь апакаліпсіса» Сяргея Законнікава, «Одзіум» Янкі Сіпакова, больш за паўсотню твораў эпічнай прозы і драматургіі: раман «Злая зорка» і аповесць «Зона павышанай радыяцыі» Івана Шамякіна, аповесці «Родны кут» і «Еўка» Барыса Сачанкі, «Краем Белага шляху» Віктара Карамазава, апавяданні «Львы» Івана Пташнікава, «Гасцініца над Прыпяццю» Івана Навуменкі, п’есы «Бездань» Міколы Матукоўскага, «Хто вінаваты», «Толькі мёртвыя не вяртаюцца» Івана Чыгрынава, «Адцуранне» Аляксея Дударава і іншыя. Кнігі «Палескі смутак», «Бабчын», «Хойніцкі сшытак» і «Замкнёны дом» Міколы Мятліцкага цалкам прысвечаны Чарнобылю.

- Вершы і паэмы больш як 60 паэтаў уключаны ў зборнік «Зорка Палын». Творы, якія з’явіліся пасля наведвання пісьменнікамі чарнобыльскіх мясцін, склалі кнігу «Прайсці праз зону». Чарнобыльская трагедыя адлюстравана ў публіцыстычных і дакументальна-мастацкіх творах, сведчаннем гэтаму «Запіскі аб радыяцыі» Барыса Сачанкі, артыкулы Алеся Адамовіча з яго зборніка «Апакаліпсіс па графіку», аповесці «Сталі воды горкія» Васіля Гігевіча і Алега Чарнова, «Выбух над Прыпяццю» Алеся Крыгі і іншыя. У 1990 г. выйшаў зборнік «Зона бяды» (укладальніца Тамара Чабан). Паэт Мікола Мятліцкі склаў зборнік публіцыстыкі «Чарнобыльская рана».

- Беларуская літаратура адлюстравала агульнанародную бяду і трагедыю асобнага чалавека з рэалістычнай праўдзівасцю, бязлітасна-суровай дакументальнасцю. «Чарнобыльскую малітву» Святланы Алексіевіч адносяць да літаратуры нон-фікшн, гэта значыць непрыдуманай, дакументальнай па сваёй фактуры. Твор перакладзены больш чым на дваццаць моў, яго параўноўваюць з уздзеяннем шокатэрапіі: настолькі моцнае ўражанне выклікае прачытанае. Аўтарка «Чарнобыльскай малітвы» атрымала прэстыжную еўрапейскую літаратурную прэмію імя Ёгана Готфрыда Гердэра, расійскую прэмію «Трыумф», літаратурную прэмію «Сведкі міру».

- У дзённікавым жанры напісаны «Чарнобыльскі сшытак» Ніны Рыбік, а апавяданні, якія ўвайшлі ў кнігу прозы «Права на адсяленне», грунтуюцца на ўласна ўбачаным і перажытым. «Пракляты Чарнобыль! Адкуль ты зваліўся на нашу галаву?» — разам са сваімі героямі задае пытанне Леанід Левановіч у рамане «Палыновы вецер». Існаваннем у зоне выпрабоўвае сваіх герояў Васіль Быкаў у аповесці «Воўчая яма». Успрымаючы Чарнобыльскую катастрофу як астранамічную, глабальную з’яву, прыкладна гэтак жа выказаўся паэт Васіль Зуёнак у творы «Касмічная вестка»: «І Чарнобыль весткаю касмічнай стаў каля расчыненых дзвярэй…». Кнігу лірыкі Віктара Вабішчэвіча «Чорны боль» складаюць прачулыя маленні за родны край. Невыпадкова свой верш Таіса Мельчанка назвала менавіта так: «Распад душы». Пісьменнікі ўсё больш адчуваюць пагрозу іншага Чарнобыля — духоўнага, і таму так устрывожана гучаць іх галасы.